# АБ НОВАЙ КАНЦЭПЦЫІ КУРСА "АГУЛЬНАЕ БІБЛІЯТЭКАЗНАЎСТВА"

МАТУЛЬСКІ Р.С.,
канд.пед.навук, дацэнт,
СТРЫЖОНАК І.М.,
ст. выкладчык

Паглыбленне сацыяльных фучкцый бібліятэк, ускладненне задач бібліятэчнай дзейнасці вызначаюць асноўныя тэндэнцыі развіцця цыкла профільных спецыяльных вучэбных дысцыплін, сярод якіх адно з галоўных месцаў займаюць бібліятэказнаўчыя курсы. На першы план навучання студэнтаў бібліятэказнаўству вылучаюцца тэарэтычныя і метадалагічныя аспекты дзейнасці бібліятэк.

Бібліятэказнаўцы і бібліятэкары-практыкі ў апошнія гады актыўна абмяркоўваюць праблемы курса з мэтай прывядзення яго структуры і зместу ў адпаведнасць з дасягненнямі сусветнага і айчыннага бібліятэказнаўства, патрабаваннямі сучаснай практыкі дзейнасці бібліятэк. Да гэтых праблем сталі ставіцца з пільнай увагай у сувязі з абмеркаваннем новай канцэпцыі вышэйшай бібліятэчнай адукацыі ў рэспубліцы, распрацоўкай новага пяцігадовага вучэбнага плана падрыхтоўкі спецыялістаў у МІК.

Павышэнне адукацыйнага ўзроўню карыстальнікаў бібліятэк, ускладненне інфармацыйных запытаў, рост аб'ёму інфармацыі, укараненне ў дзейнасць бібліятэк новых тэхналогій патрабуюць бібліятэчных спецыялістаў больш высокай кваліфікацыі, якія валодаюць фундаментальнымі тэарэтычнымі ведамі неабходнымі для прыняцця самастойных рашэнняў у пастаянна пераменлівай сітуацыі. Такую падрыхтоўку і павінен даць ім курс "Агульнае бібліятэказнаўства". Калі мы прааналізавалі апошнія вучэбныя планы па курсу, а таксама планы аналагічных курсаў, што вывучаюцца ў бібліятэчных школах і каледжах ЗША, параўналі іх з іншымі курсамі бібліятэказнаўчага, бібліяграфазнаўчага і інфармацыйнага

цыклаў, то прыйшлі да высновы аб неабходнасці карэннага рэфарміравання курсу.

На наш погляд, больш дакладна суадносіцца з мэтамі і задачамі курса, яго зместам такая назва, як "Агульнае бібліятэказнаўства" (раней было — "Тэорыя бібліятэказнаўства"). Распрацавана новая структура курса на падставе асноўных палажэнняў сістэмнага падыходу з захаваннем лагічнага прынцыпу выкладання матэрыялу ад агульнага да асобнага. Структура курса складаецца з чатырох частак.

У першай частцы "Бібліятэка і грамадства" вывучаюцца агульныя паняцці аб інфармацыі, сродках і спосабах яе фіксацыі і распаўсюджвання, а таксама аб'ектыўныя прычыны і прадумовы ўзнікнення, развіцця і існавання бібліятэкі як сацыяльнага інстытута, яе сутнасць, галоўныя задачы, месца і роля ў сферы інфармацыйна-дакументных камунікацый. У гэтым раздзеле курса разглядаюцца асноўныя грамадскія функцыі бібліятэк, даецца ўяўленне аб бібліятэцы як сістэме.

У другой частцы курса вывучаецца бібліятэчная справа як сфера дзейнасці. Гэта прадугледжвае вывучэнне зместу паняцця "бібліятэчная справа", вывучэнне яе сутнасна-функцыянальнай структуры, якая складаецца з чатырох асноўных кампанентаў: бібліятэчнай дзейнасці, бібліятэчнай навукі, бібліятэчнай адукацыі і кіравання бібліятэчнай справай.

Пільная ўвага звяртаецца на трэці раздзел курса, які знаёміць з асаблівасцямі арганізацыі дзейнасці бібліятэк Рэспублікі Беларусь. Разглядаюцца асноўныя тыпы і віды бібліятэк РБ, функцыяніраванне іх у розных формах і інтэграваных аб'яднаннях, вывучаюцца важнейшыя якасці сукупнай рэспубліканскай сістэмы бібліятэк.

У апошняй частцы курса даецца характарыстыка бібліятэказнаўства як навукі, вызначаюцца яе сутнасць, аб'ект, прадмет, арганізацыйная і змястоўная структура, асноўныя законы і заканамернасці развіцця бібліятэчнай справы. Матэрыял курса даецца на падставе назапашанага сусветнага вопыту ў дадзенай галіне, але асаблівая ўвага звяртаецца на спецыфіку развіцця бібліятэчнай справы ў РБ.

Выкладанне перапрацаванага, рэфарміраванага курса ажыццяўлялася ў першым паўгоддзі 1992/93 навучальнага года студэнтам першага курса. Гэта дазваляе зрабіць некаторыя вывады. Нягледзячы на тое, што курс мае тэарэтычны характар, паспяховае засваенне асноўных палажэнняў немагчыма без ведання практычнага вопыту дзейнасці бібліятэк. Таму для вывучэння тыпалагічных асаблівасцей розных бібліятэк і бібліятэчных сетак неабходна ў час вучэбнай практыкі праводзіць практычныя занятк і па курсу ў саміх бібліятэках. Акрамя таго, рэалізаваць асноўныя палажэнні фундаментальнай бібліятэказнаучай дысцыпліны з улікам сусветнага вопыту і ў адпаведнасці з асаблівасцямі дзейнасці бібліятэк РБ магчыма толькі ў рамках 120--150 вучэбных гадзін.

Ажыццяўленне прапанаванай вучэбнай праграмы дазволіць даць студэнтам неабходныя фундаментальныя тэарэтычныя веды для далейшага паспяховага засваення дысцыплін бібліятэказнаучага, бібліяграфазнаучага і інфармацыйнага цыклаў.

## НЕКАТОРЫЯ АСПЕКТЫ ЎЗАЕМАДЗЕЯННЯ БІБЛІЯТЭЧНАЙ АДУКАЦЫІ І БІБЛІЯТЭЧНАЙ ПРАКТЫКІ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ВЫКЛАДАННЯ КУРСА "АРГАНІЗАЦЫЯ, ЭКАНОМІКА І КІРАВАННЕ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СПРАВАЙ")

СТРЫЖОНАК І.М.,
ЧАПЛЫГІНА Т.І.,
ст. выкладчыкі

Бібліятэчная адукацыя павінна адпавядаць патрабаванням бібліятэчнай справы, адлюстроўваць яе сучасны стан, дасягненні, перспектывы развіцця. Бібліятэчная практыка -- аснова бібліятэчнай адукацыі. Дыялектыка ўзаемадзеяння паміж імі ў тым, што бібліятэчная адукацыя рыхтуе для практыкі кваліфікаваныя кадры, што спрыяе яе далейшаму развіццю. Асабліва цесная сувязь з дзейнасцю бібліятэк існуе ў выкладанні спецыяльных дысцыплін, такіх як курс "Арганізацыя, эканоміка і кіраванне бібліятэчнай справай".